**МЕМАРАНДУМ**
**аб заснаванні Беларускага інстытута тэатра (БІТ)**

9 верасня 2023
Варшава, Польшча / анлайн

## Прэамбула:

Ініцыятыўная група “Беларускае тэатральнае кам’юніці” ў асобах Анжэлы Крашэўскай, Валянціны Мароз, Паліны Дабравольскай, Кацярыны Раманчык, Алены Канцэвіч і іншых склікалі канферэнцыю з удзелам прадстаўнікоў/_ніц прафесійнай тэатральнай супольнасці Беларусі, а таксама іншых зацікаўленых бакоў, для абмеркавання заснавання Беларускага Інстытут тэатра (далей - БІТ).

## Мэта

Дадзены Мемарандум акрэслівае прыхільнасць і ўдзел прафесійнай супольнасці ў галіне тэатра ў заснаванні і развіцці Беларускага Інстытута тэатра.

## Узгодненыя палажэнні аб дзейнасці БІТ:

**Місія**:

Вывучэнне, захаванне і развіццё беларускага тэатра і звязаных з ім відаў мастацтва; прасоўванне беларускага тэатра ўнутры Беларусі і за яе межамі; стварэнне ўмоваў для развіцця беларускіх прафесіяналаў у сферы выканальніцкіх мастацтваў.

**Прынцыпы дзейнасці БІТ:**

- Поле дзейнасці – усё поле беларускага тэатра: як унутры Беларусі, так і за яе межамі
- Дэцэнтралізацыя паміж малымі і вялікімі гарадамі і мясцовасцямі
- Недыскрымінацыя па гендары, узросце і іншых крытэрах
- Адвакацыя правоў прадстаўнікоў/_ніц прафсупольнасці
- Забеспячэнне балансу паміж бяспекай і празрастасцю
- Развіццё міждысцыплінарнага ўзаемадзеяння.

**Асноўныя напрамкі дзейнасці (функцыі) БІТ:**

1) **Праца з прафесійнай супольнасцю беларускага тэатра і сумежных мастацтваў. Адвакацыя правоў адмыслоўцаў беларускага тэатра**

- Фасілітацыя і падтрымка ўзаемадзеяння ўнутры прафесійнай супольнасці беларускага тэатра ў Беларусі і за мяжой.
- Даследаванне прафесійнай супольнасці, у тым ліку вывучэнне патрэб дзеячаў тэатра і мапінгі структуры тэатральнай індустрыі.
- Стварэнне і каардынацыя праграм кансультацыйнай падтрымкі (юрыдычных, каардынацыйнай, псіхалагічнай і інш.).

2) **Развіццё прафесійнай нефармальнай і акадэмічнай адукацыі ў галіне тэатра**
- Распрацоўка методык, адукацыйных праграм і рамкі рэфармавання акадэмічнай адукацыі.
- Спрыянне абмену досведам і трансляцыя досведу беларускіх дзеячаў тэатра.

3) **Стымуляванне і стварэнне ўмоваў для тэатральнай вытворчасці і сумежных праектаў прафесійнай супольнасці.**
- Субгрантынгавыя праграмы.
- Праграмы міжнароднага супрацоўніцтва.
- Развіццё эфектыўнага інстытуту менеджменту ў галіне тэатра.

4) **Навукова-даследчая дзейнасць у галіне тэатра і тэатральнай (культурнай) палітыкі**
- Фіксацыя і каталагізацыя бягучага тэатральнага працэсу.
- Архівацыя і каталагізацыя тэатральнай спадчыны Беларусі.
- Распрацоўка лічбавых прадуктаў і для сістэматызацыі і прасоўвання тэатральнай спадчыны Беларусі.

5) **Камунікацыйная дзейнасць**
- Умацаванне міжнародных сувязяў і партнёрстваў, прасоўванне беларускага тэатра і яго павесткі ў беларускай і замежнай медыйнай прасторы.

***

**Дзеянні па заснаванні і запуску функцыянальных кірункаў дзейнасці БІТ:**

1) Збор подпісаў Мемарандума.
2) Публікацыя справаздачнасці аб працы на Канферэнцыі
3) Запуск працэсу рэгістрацыі юрыдычнай асобы (уключна юрыдычнае суправаджэнне).
4) Фармаванне адміністрацыйнага актыву і кадраў БІТ і асобных функцыянальных кірункаў праз фасілітацыю працоўных сустрэч прафесійнай супольнасці.
5) Стратэгічнае планаванне (фіналізацыя).
6) Выпрацоўка палітык дзейнасці.
7) Распрацоўка фандрайзінгавай стратэгіі і сталая праца па зборы сродкаў.
8) Распрацоўка камунікацыйнай стратэгіі і першых камунікацыйных пляцовак (вэб-сайт, сацыяльныя сеткі).
9) Набор кадраў на функцыянальныя кірункі, якія атрымліваюць фінансавую падтрымку.

## Тэрмін дзеяння Мемарандума:

Гэты Мемарандум аб заснаванні БІТ уступае ў сілу з 9 верасня 2023 г. і будзе дзейнічаць да паспяховага стварэння і пачатку працы арганізацыі.

## Агляд і папраўкі:

Асобныя палажэнні Мемарандума могуць быць скарэктаваныя і дапоўненыя па меры неабходнасці, каб адлюстраваць, як змяняюцца патрэбы і абставіны, звязаныя са стварэннем БІТ.
Мемарандум можа быць падпісаны любым прадстаўніком/прадстаўніцай тэатральнай прафесійнай супольнасці Беларусі.

## Подпісы:

Падпісваючы дакумент, мы падтрымліваем ініцыятыву заснавання Беларускага інстытута тэатра (БІТ) і выказваем свой намер супрацоўнічаць у межах сваіх прафесійных кампетэнцый і магчымасцяў.